Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-02-09

# Вучыцца нацыянальнай цярпімасці і патрыятызму

*Пакуль сярод нас будуць людзі, гатовыя дараваць катам іх злачынства і дапамагчы былым нацыстам зноў здабыць маральную раўнавагу, неабходна пісаць пра гады нацысцкага варварства дзеля таго, каб увесь свет не забываў пра гэта.*

**Франсуа Марыяк.**

У 2012 годзе ў выдавецтве Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта пабачыў свет зборнік артыкулаў “Вайна вядомая … і невядомая”, прысвечаны гісторыі Халакоста ў Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці. Безумоўна, тэма Халакоста — вельмі складаная для любога даследчыка гэтай праблемы. У той жа час яна вельмі важная як для вывучэння малавядомых старонак Вялікай Айчыннай вайны, так і для выхавання талерантнасці ў грамадстве.

Пад адной вокладкай гэтай сапраўды ўнікальнай кнігі сабраны артыкулы як сусветна вядомых даследчыкаў гэтай праблемы, так і школьнікаў і педагогаў з Асіповіцкага раёна.

З артыкула ізраільскага вучонага, пісьменніка і журналіста Анатоля Кардаша, што адкрывае першы раздзел кнігі “Вучоныя пра Халакост”, чытачы змогуць атрымаць амаль вычарпальную інфармацыю пра трагічную старонку гісторыі яўрэйскага народа, якую даследчыкі называюць Халакост, або Катастрофа. У артыкуле адзначаецца, што колькасць загінуўшых у гады Другой сусветнай вайны яўрэяў складае каля 6 мільёнаў. Паводле папярэдніх падлікаў, якія правёў доктар гісторыі старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра дыяспары пры ўніверсітэце Тэль-Авіва Леанід Смілавіцкі, у выніку нацысцкага генацыду на тэрыторыі СССР было знішчана каля 2,5 мільёна яўрэяў. Доктар гістарычных навук прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Эмануіл Іофе на аснове вывучэння фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі і інтэрв’ю аўтара з жывымі сведкамі нацысцкага генацыду яўрэйскага насельніцтва БССР прыйшоў да высновы, што на тэрыторыі Беларусі ахвярамі Халакоста сталі каля 805 тысяч яўрэяў, у тым ліку каля 715 тысяч беларускіх яўрэяў.

Аддаючы належнае адзначаным намі даследчыкам падкрэслім, што менавіта артыкулы, аўтарамі якіх з’яўляюцца навучэнцы і настаўнікі школ з Асіповіцкага раёна, а таксама сабраныя імі ўспаміны відавочцаў, склалі аснову гэтай кнігі.

Нельга не адзначыць, што галоўная роля ў падрыхтоўцы гэтага выдання належыць настаўніку гісторыі сярэдняй школы № 2 Асіповіч метадысту раённага аддзела адукацыі Неаніле Цыганок. Найбольш поўную і грунтоўную характарыстыку той рабоце, якую праводзіць з 2006 года гэтая апантаная клопатам пра захаванне гістарычнай памяці даследчыца, дае журналіст Аляксандар Баршай: “…вярнуць з нябыту не адну, а сотні яўрэйскіх душ, знішчаных у страшныя гады нямецкай акупацыі, аднавіць імёны герояў, якія ратавалі яўрэяў, рэканструяваць гістарычную праўду, якую многія не ведаюць або хочуць забыць, — усё гэта таксама патрабуе вялікай мужнасці, праведнасці, вялікай сардэчнасці, сілы і адказнасці”.

Раздзел “Бездані Халакоста” пачынаецца з даследавання навучэнцаў сярэдняй школы № 2 Асіповіч Віты Новік і Валерыі Зайцавай, прысвечанага гісторыі Халакоста ў Асіповіцкім раёне. Юнымі даследчыкамі пад кіраўніцтвам Неанілы Львоўны Цыганок былі ўстаноўлены і апублікаваны імёны і прозвішчы 308 яўрэяў, якія жылі ў Асіповічах напярэдадні вайны, а таксама імёны 201 яўрэя, што загінулі ў 1941 годзе ў мястэчку Свіслач.

На аснове ўспамінаў відавочцаў навучэнка Ясеньскай сярэдняй школы Кацярына Дрозд здолела паказаць маштабы той жахлівай трагедыі, якая напаткала яўрэяў мястэчка Ясень. Нельга без слёз чытаць аповед навучэнкі Дараганаўскай сярэдняй школы Наталлі Лосік пра драму выхаванцаў і выхавальнікаў дзіцячага санаторыя “Крынкі”, большасць з якіх загінула ад рук фашысцкіх акупантаў.

Адчуць увесь трагізм ваеннага ліхалецця дазваляюць успаміны больш як 30 жыхароў Асіповіцкага раёна, сабраныя Неанілай Цыганок на працягу 2006—2012 гадоў і змешчаныя ў раздзеле “Наша памяць пра вайну”. Надзвычай важнае значэнне мае раздзел кнігі “Захаванне памяці”, у якім нястомны даследчык распавядае пра сапраўдныя ўрокі чалавечнасці, якія змаглі атрымаць яе вучні і паплечнікі, калі вывучалі гісторыю Халакоста ў Асіповіцкім раёне.



Значную каштоўнасць уяўляюць дадаткі да кнігі. Тут змешчаны перадваенныя фотаздымкі яўрэйскіх сем’яў, вытрымкі-сведчанні пра Вялікую трагедыю з архіўных фондаў і апублікаваных дакументаў, фатаграфіі Праведнікаў народаў свету і тых людзей, якіх яны здолелі выратаваць ад смерці. Дарэчы, дзякуючы намаганням Неанілы Цыганок і яе аднадумцаў, былі ўстаноўлены імёны каля 30 сапраўдных герояў — жыхароў Асіповіцкага раёна, якія ў час Вялікай Айчыннай вайны ратавалі яўрэяў. Дзесяць чалавек з гэтага спіса — Настасся і Данііл Акіменкавы, Мікалай Кудраватых, Аляксандра Скрыпко, Марыя Дыбаль, Аляксандра Звоннік, Фёдар Мятліцкі, Аляксей Дзянісаў, Лідзія і Міхаіл Міхадзюк — атрымалі ў свой час званне Праведнікаў народаў свету.

Такім чынам, можна канстатаваць, што з выхадам кнігі “Вайна вядомая … і невядомая” быў зроблены значны крок на доўгім і цяжкім шляху даследавання невядомых старонак нашай гісторыі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Шкада толькі, што тыраж гэтага надзвычай неабходнага для грамадства і цікавага для шырокага кола чытачоў выдання склаў усяго 200 экзэмпляраў.

**Валянцін МАЗЕЦ,**
**кандыдат гістарычных навук,**
**старшы навуковы супрацоўнік**
**Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**